# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ И АРХЕОЛОГИЯ

**УДК 94(476)/05/10/**

## ГЕНЕЗІС КНЯЖАЦКАЙ УЛАДЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У VIII – XI СТАГОДДЗЯХ

***Ю.М. КЕЖА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Даследаванне характарызуе эвалюцыю і развіццё інстытута княжацкай улады на беларускіх землях ад перыяду «ваеннай дэмакратыі» (VI – VIII стст.) да станаўлення самастойнага Полацкага княства ў XI стагоддзі. Аналіз зроблены на падставе вывучэння крыніц (летапісаў, літаратурных твораў) і гістарыяграфіі. Зроблены параўнаўчы аналіз генэзісу княжацкай улады Полацкага і Тураўскага земляўкнястваў у кантэксце дзяржаватворчых працэсаў іншых зямель Беларусі і Усходняй Еўропы. Адзначаецца, што з прыходам нарманаў-варагаў змяняецца характар княжацкай улады (сацыяльнае адасабленне карэлюецца з этнічным). У канцы X – пачатку XI стагоддзя за князем замацоўваецца статус вярхоўнага ўладара сваёй зямлі, гаранта абароны княства ад знешняй небяспекі і ахоўніка ўнутранага міру. Адбываецца канчатковая лігітымізацыя княжацкай улады ў мясцовым грамадстве. У XI стагоддзі на землях Кіеўскай дзяржавы ўзнікае праблема наследавання княжацкай спадчыны, якая з пачатку XII стагоддзя становіцца актуальнай і на Полаччыне.*

**Уводзіны.** У «Аповесці аб мінулых часах» аўтар гаворыць аб некаторых усходнеславянскіх племянных княжаннях: палян, драўлян, дрыгавічоў, крывічоў – палачан і наўгародскіх славен: «По сей братьи (Кій, Шчэк і Хорыў – *Ю. К.*) почаша держати родъ ихъ княжение в поляхъ, а въ деревляхъ свое, а дрьговичи свое, а словене свое в Новегороде, а другое на Полоте, иже и полочане» [15, с. 8]. Гэтыя княжанні ўпамінаюцца яшчэ да запрашэння варажскіх князеў (862). Такім чынам, аўтар «Аповесці аб мінулых часах» падкрэсліваў, што княжацкая ўлада на ўсходнеславянскіх землях існавала да запрашэння Рурыка. Большасць даследчыкаў разглядаюць гэтыя княжэнні як племянныя саюзы, якія былі тыповай з'явай для апошняй стадыі першабытнаабшчыннага ладу – ваеннай дэмакратыі. Але А.П. П'янкоў бачыў у іх дзяржаўныя ўтварэнні і выказваў думку аб існаванні Крыўскага племяннога саюза, з якога з цягам часу выйшла княжэнне палачан: «Полочане первоначально входили в состав Кривского племенного союза и только впоследствии образовали особое княжение. Это произошло, очевидно, после возникновения города Полоцка, от имени которого это княжение и получило свое название» [26, с. 158]. Вылучэнне палачан з Крыўскага племяннога саюза, на думку А.П. П'янкога, адбылося ў VII – VIII стагоддзях [26, с. 164].

**Асноўная частка.** Вытокі княжацкай улады ва ўсходнеславянскіх племянных саюзах – княжаннях – трэба адносіць да перыяду ваеннай дэмакратыі (VI – VIII стст). Сутнасць грамадскага ладу гэтага перыяду палягала ў народаўладдзі, калі ўсе мужчыны, якія прымалі ўдзел у міжплемянных ваенных сутыкненнях мелі права голасу пры прыняцці грамадска значных рашэнняў. Кожная воласць кіравалася з боку ўстаноўчазаканадаўчага – вечам, а з боку выканаўчага – князем [12, с. 34]. Як пазначае В.А. Плотнікава: «Его (народнага сходу – *Ю. К.*) участниками являлись не все члены племени, а только мужчины. Однако народное собрание оказалось органом управления малооперативным, поскольку собирались на него до трех дней вследствие расселения членов племени на разных территориях. И в связи с этим менее важные дела племени решали старейшины (principes) – племенная знать, которая заранее обсуждала те вопросы, которые могло решить только народное собрание» [23]. Такім чынам, асаблівая роля ў грамадскім жыцці гэтага перыяду належала мясцовай родаплемяннай арыстакратыі. Родавая арыстакратыя традыцыйна валодала значным аўтарытэтам і, такім чынам, магла актыўна ўплываць на ход падзей [19, с. 44].

Зараджэнне першых протадзяржаўных утварэнняў (племянных княжанняў) адбывалася ў пастаянных узброенных сутыкненнях паміж прадстаўнікамі розных плямен. Гэты перыяд характарызуецца паступовай славянскай каланізацыяй беларускіх земляў і асіміляцыяй мясцовага балцкага насельніцтва. Узброеныя канфлікты ў гэты час маглі адбывацца не толькі паміж славянамі і балтамі ў працэсе міграцыі насельніцтва, шмат з іх мелі міжабшчынны характар. На што ўказваюць знаходкі зброі ў пахаваннях усходнелітоўскіх курганоў, куды ў гэты час славянская каланізацыя яшчэ не дайшла [13, с. 135].

Акрамя пастаянных узброеных канфліктаў адбываецца працэс разлажэння родавых адносін. Гэты працэс суправаджаўся перасяленнем насельніцтва з родавых гарадзішч на адкрытыя селішчы, якія забяспечвалі лепшыя магчымасці для вядзення гаспадаркі [1, с. 360 – 361]. Рост насельніцтва і развіцце спосабаў вытворчасці прывялі да прагрэсу сельскай гаспадаркі і рамесніцтва. Гэтыя працэссы паскараліся перамяшчэннем славян на вялікія адлегласці ў ходзе міграцый і актыўным асваеннем новых тэрыторый. Такія маштабныя перамяшчэнні яшчэ больш разбуралі стары грамадскі лад пляменаў і паслаблялі родавыя сувязі [19, с. 45].

Яшчэ адным штуршком для развіцця ўсходнеславянскага грамадства стала адкрыцце Каспійска-Волжска-Балтыйскага воднага гандлевага шляху, які спрыяў развіццю кантактаў усходніх славян са знешнім светам, а таксама адкрыцце на рубяжы VIII – IX стагоддзяў Балтыйска-Дняпроўска-Чарнаморскага гандлевага воднага шляху, што дазволіла ўсходнеславянскім пляменам развіваць узаемаадносіны з краінамі Балтыйскага рэгіену і Візантыяй [23].

Такое змяненне ладу жыцця, засваенне новых тэрыторый, адкрыцце новых гандлевых шляхоў і сувязей са знешнім светам, прагрэсіўнае развіцце гаспадарчых адносін прывялі да змены грамадскага ладу. Як пазначае Я.У. Новікаў: «Змяненне штодзенных варункаў жыцця, адкрыцце новых земляў, пашырэнне межаў знаемага свету і кантакты з людзьмі, якія належалі да іншых культур, парушалі традыцыйны светапогляд і цэльнае ўяўленне аб навакольным свеце» [19, с. 46]. Трэба адзначыць, што асноўным каталізатарам змяненняў традыцыйнага светапогляду і традыцыйнай будовы родаплемяннога грамадства была вайна. У час міжплемянных і міжабшчынных сутыкненняў, пастаянных войнаў, асноўнай мэтай якіх было рабаўніцтва і захоп матэрыяльных каштоўнасцей, зніжалася роля радавых старэйшын, якія ўжо не маглі падтрымліваць бяспеку і ўнутраны парадак, ажыццяўляць ранейшае штодзеннае кіраўніцтва абапіраючыся на свой аўтарытэт. У выніку радавая невайсковая знаць, якая ў папярэднія часы іграла галоўную ролю ў грамадскім і палітычным жыцці, саступае свае месца вайсковай дружыне на чале з правадыром, але па-ранейшаму захоўвае саваё высокае становішча. Такім чынам вайсковая арганізацыя – дружына – набывае асобны статус у племянным грамадстве. На чале дружыны стаяў правадыр, які атрымаў найменне «князь» у славянскай мове і «kunigas» у балтаў. На думку І.Н. Данілеўскага, слова «князь» было прынята праславянамі з прагерманскай або готскай мовы і роднасна словам «конунг», «konig», «king» (кароль) [6]. Гэтае слова пазначае старэйшыну рода [25, с. 324]. Зыходзячы са значэнняў, якія гэта слова атрымала ў заходнеславянскіх мовах (славацк. Knaz; польск. ksiadz – «святар»), першапачаткова князі выконвалі функцыю не толькі свецкую, але і духоўную (функцыю паганскіх жрацоў) [6]. На гэта часткова ўказваюць курганныя пахаванні князеў-язычнікаў.

Як пазначае М.А. Дз’яканаў, карані княжацкай улады зыходзяць з дагістарычнага патрыярхальнага ладу [8, с. 146]. Старажытная дружына разам з правадыром-князем выходзіць у авангард палітычнага і грамадскага жыцця плямен-княжанняў. Адбываецца так званы падзел грамадскіх абавязкаў. Вайсковая справа прывяла да вылучэння і адасаблення дружыны на чале з князем ад астатняга невайсковага грамадства. Аб сацыяльным адасабленні княжацкай дружыны ад рэшты племені ўказваюць знаходкі жылых памяшканняў і зброі на славянскім гарадзішчы Хатомель і балцкім гарадзішчы Нікадзімава [1, с. 342 – 343]. Такім чынам, князь з дружынай пераносяць свае жытлы з селішчаў на гарадзішчы. Грамадства працуе на матэрыяльнае забеспячэнне князя і дружыны, на яго падтрымку, бо ўсё насельніцтва ўжо не можа весці войны, адрываючыся ад сваёй асноўнай справы – земляробства [5]. Невайсковае грамадства, такім чынам, мае патрэбу ў прафесійных ваярах, якія б забяспечвалі ўнутраную і знешнюю стабільнасць княжання. Цяпер пад княжацкай аховай магло даволі спакойна развівацца рамесніцтва, на гарадзішчы маглі адбывацца народныя сходы і іншыя грамадскія мерапрыемствы, спраўляцца рэлігійныя абрады і г.д.

Вынік развіцця Полацка ў перыяд ваеннай дэмакратыі – гэта яго станаўленне як палітычнага і адміністрацыйнага цэнтра крывічоў-палачанаў, асяродак існавання урбаністычнай славянскай культуры. На думку Д.У. Дука, пачатковая функцыя княжацкай улады ў гэты перыяд – кіраўніцтва працэсам славянскай каланізацыі Падзвіння [10, с. 16].

Пачатак IX стагоддзя на беларускіх землях стаў часам завяршэння пэўнага этапу грамадскага развіцця. Найбольш заўважным знешнім уплывам на ўсходнеславянскія (беларускія) землі стаў прыход нарманаў – жыхароў часткі Скандынаўскай паўвыспы. З іх прыходам, дзяржаўная ўлада ўсходнеславянскіх земляў зрабіла новы крок у сваім палітычным развіцці. Скандынаўскага паходжання былі першыя беларускія князі: Рагвалод у Полацку і Тур у Тураве.

У летапісе пад 859 годам пазначана, што калі варагі бралі даніну з чудзі, славенаў, меры і крывічаў, хазары спаганялі яе з палянаў, севяранаў і вяцічаў [15]. У 20-я гады IX стагоддзя адбываецца адкрыццё гандлевых шляхоў па Дзвіне і Дняпры, што непасрэдным чынам звязана з прыходам нарманаў на беларускія землі. З’яўленне варагаў добра фіксуецца манетнымі скарбамі. Скарб, знойдзены ў Магілеўскай губерні ў 1822 годзе, быў захаваны ў канцы 820-х гадоў і ўтрымліваў 1300 манет і рэзаных дырхемаў дынастый Умаядаў, Абасідаў, Ідрысідаў. Скарб крыху пазнейшага часу быў знойдзены ў Падзвінні ў прасторы паміж Дзвіной і Дняпром, каля возера Пліса і возера Нарач [1, с. 455 – 457]. Засноўваючыся на гэтых дадзеных, можна лічыць 820-я гады пачаткам пранікнення варагаў на беларускія землі. На думку А. Катлярчука, на рачных прасторах паміж Балтыйскім і Чорным морам нарманы засноўваюць гандлёвую карпарацыю, якая атрымала назву «варагі» (varjager, varingar): «Гэтае слова мае скандынаўскі корань «var» – клятва» [14].

Полацк першай паловы IX стагоддзя пераўтвараецца з племяннога цэнтра ў гандлёва-рамеснае паселішча на важным гандлёвым шляху «з варяг у грэкі», які затым зрабіў яго адным з магутных гарадоў Усходняй Еўропы, у гэтай сувязі ён не мог пазбегнуць увагі з боку правадыроў нарманскіх дружын.

Пад 862 годам «Аповесць аб мінулых часах» пазначае: «Изъгнаша Варяги за море, и не даша имъ дани, и почаша сами в собе володети» [15, с. 19]. Выгнанне варагаў, пацвярджаецца нумезматычнымі да-

дзенымі. Прыкладна з 860-х гадоў перастае пастурапаць арабскае срэбра ў Швецыю і на Готланд [27, с. 109]. З гэтага паведамлення летапісу вядома, што спроба скандынаваў-варагаў падпарадкаваць усходнеславянскія, фіна-угорскія і балцкія плямены скончылася няўдала. Паведамленне «И не бе в нихъ правды, и вста родъ на род и быша усобице в них, и воевати сами на ся почаша» [15, с. 19] гаворыць аб наступных міжплемянных і міжабшчынных сварках, якія пачаліся пасля варажскага выгнання.

На думку Я.У. Новікава, найбольш развітым на той час пляменам славен і крывічоў, якія ўжо пачалі выходзіць са стадыі ваеннай дэмакратыі, была патрэбна знешняя кіруючыя сіла, якая магла б забяспечыць знешнюю бяспеку, унутраную стабільнасць грамадскага жыцця, ахову гандлевых шляхоў зносін. «Добрыя ваяры, і падарожнікі, яны маглі адыграць нейтральную ролю ва ўпарадкаванні мясцовых спраў, знаходзячыся ў аднолькавых дачыненнях з усімі спаборнымі групоўкамі» [19, с. 101]. Гэтыя фактары і прывялі да запрашэння ў тым жа 862 годзе славянскай і фіна-угорскай знаццю (плямены крывічаў, славенаў, чудзі, меры) на княжэнне ў Ладагу варажскага конунга Рурыка з братамі Сінеўсам і Труварам.

Дакладна не вядома на якіх умовах быў запрошаны Рурык з братамі. Як сцвярджае І.Н. Беляеў, Рурык з братамі былі прызваны славенскім (ладажскім ці наўгародскім) вечам і залежылі ад яго. Падобным чынам полацкім вечам («залежным ад наўгародскага») быў запрошаны ў сярэдзіне X стагоддзя першы вядомы нам полацкі князь Рагвалод, з мэтай адасобіцца ад Ноўгарада, які знаходзіўся ў такой жа залежнасці ад веча, як і Рурык у IX стагоддзі [2, с. 311]. На думку І.Я. Фраянава, Рурык (862 – 879 гг.) быў запрошаны наўгародскімі славенамі як найміт для правядзення пэўнай вайсковай аперацыі, у выніку чаго ён знішчыў мясцовую родаплемянную знаць: «Военная помощь, оказанная варягами новгородским словенам, была, очевидно, довольно эффективной, что и побудило их конунга посягнуться на местную княжескую власть» [35, с. 11]. Пра фізічнае знішчэнне Рурыкам апазіцыйна настроеных прадстаўнікоў наўгародскай палітычнай эліты сведчыць паведамленне летапісу пад 864 годам: «избежаша отъ Рюрика изъ Новагорода въ Кіевъ много Новгородцкых мужей» [15, с. 24]. Пасля знішчэння наўгародскай арыстакратыі на чале з Вадзімам Харобрым, Рурык ператвараецца ў адзінаўладнага гаспадара паўночнай часткі ўсходнеславянскага рэгіёну са сталіцай у Ноўгарадзе.

Пад 862 годам летапіс паведамляе: «и раздая (Рурык – *Ю. К.*) мужемъ своимъ волости и городы рубити: овому Полътескъ, овому Ростовъ, другому Белоозеро. И по тем городомъ суть находнице варязи» [15, с. 21]. Не вядома імя першага полацкага князя, але верагодна, што па этнічным паходжанні як «муж Рурыка» ён быў скандынавам [3, с. 148]. Такім чынам 862 год можа лічыцца пачаткам дзяржаўнасці і на беларускіх землях.

Слова «князь», «конунг», «kunigas» пазначае старэйшыну роду. З гэтага заключэння выходзяць так званыя «радавыя тэорыі». Прадстаўнікі гэтых тэорый выводзяць значэнне княжацкай улады з прынцыпу прыналежнасці ўсей улады разам з маемасцю прадстаўніку княжацкага роду. Яскравым прадстаўніком гэтай тэорыі з'яўляўся расейскі гісторык С.М. Салаўеў. У працы «История России с древнейших времен» ён пазначае: «нужно было постороннее начало, которое условило бы возможность связи между князем и народной жизнью; племена знали, что мир возможен только тогда, когда этот старшина, князь, не принадлежал ни к одному роду, был из чужого рода» [29, с. 213 – 218]. Падобнай тэорыі прытрымліваецца М.Ф. Уладзімірскі-Буданаў: «Происхождение княжеской власти доисторическое, власть принадлежит не лицу, а целому роду. Члены княжеского рода или соправительствуют без раздела власти, или делят между собой власть территориально» [34, с. 37 – 38]. Трэба адзначыць, што ў скандынаўскіх краінах даволі трывала існаваў культ княжацкай дынастыі. Конунгам мог стаць толькі законны прадстаўнік пэўнага роду [9, с. 160]. На Русі гэтым агульнапрызнаным родам былі Рурыкавічы. На беларускіх землях – нашчадкі полацкага конунга Рагвалода. Дачка Рагвалода, полацкая княжна Рагнеда, матывіруе адмову Уладзіміру Святаславічу стаць яго жонкай нізкім паходжаннем князя: «не хочу разути робичича» [15, с. 44]. Вяртанне Уладзімірам Святаславічам Полацка Ізяславу, на думку С. Дзярновіча, тлумачыцца скандынаўскімі нормамі права, паводле якіх атрыманне спадчыны адбывалася пры ўмове спынення кроўнай помсты. У скандынаваў у аснове высокага грамадскага палажэння «магутных бондаў» (storbond) палягала права наследавання зямельнага надзела (адаля) па мужчынскай, або жаночай (пры адсутнасці мужчын) лініі. У выпадку адчужэння адаля, на працягу 100 гадоў пасля яго адчужэння, нашчадкі першых уладароў мелі права на спадчыннае ўладанне [7, с. 186]. Такім чынам, наследаванне ўнукам Рагвалода, Ізяславам Уладзіміравічам, полацкай спадчыны тлумачыцца неабходнасцю кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча прытрымлівацца скандынаўскіх нормаў права.

На думку М.К. Любаўскага, пасля аб'яднання ўсходніх славян пад уладай варагаў адбылася дыферынцыяцыя гандлёва-рамеснага класа: «Вследствие усложнившихся задач по обороне и управлению страны трудно уже стало соединять одновременно торговую профессию с ремеслом княжеского дружинника. Так из военно-торгового класса Руси выделился особый, специально-военный класс – княжеской дружины» [16, с. 88]. Гэты клас пасля надання яму статусу трымальніка ўлады, перастаў лічыцца прышлым элементам і набыў, такім чынам, ролю элемента мясцовага.

Як пазначае А.Е. Праснякоў у сваей працы «Княжое право в Древней Руси»: «Князь стоит вне уклада местной жизни, вне обычноправового союза. В своей среде князья сами создают свои отноше-

ния – семейно-правовые, договорные, фактические» [22, с. 182]. Згодна з «Рускай праўдай», варагі валодалі выключна прывілеяваным становішчам у старажытнарускім грамадстве. Такім чынам, з прыходам варагаў-нарманаў, пачынаецца адлік новай княжацкай дынастыі, якая ў этнічным і сацыяльным плане стаяла «па-за» і «над» астатнім усходнеславянскім грамадствам. З сярэдзіны X стагоддзя на беларускіх землях пачынаецца адлік самастойнай варажскай дынастыі Рагвалодавічаў. У канцы 70-х гадоў X стагоддзя ў сувязі з забойствам Рагвалода і яго сыноў скончыўся першы перыяд самастойнага палітычнага існавання Полацкага княства, але дынастыя была адноўлена ў канцы X – пачатку XI стагоддзя ўнукам Рагвалода, Ізяславам Уладзіміравічам.

Магчыма, летапісны пачатак нарманскай улады ў княжэнні дрыгавічоў – Тураўскім княстве – звязаны з імем летапіснага князя Тура. Многія даследчыкі бачаць у ім легендарную асобу [4, с. 45]. Паведамленне аб Туры датычыцца 980 года: «...бе бо Рогволод перешел из заморья, имяше волость свою Полотьске, а Тур Турове, от него же и туровци прозвашася» [15, с. 63 – 64]. Але ўжо ў 988 годзе тут княжыць Святаполк Яраполкавіч. Як пазначае Л.П. Лысенка: «У раннефеадальным Тураўскім княстве, грамадскае развіцце пайшло ўжо далей, і фарміраванне княжацкай улады адбывалася на падставе новай феадальнай структуры грамадства, з фарміраваннем сталай дынастычнай улады» [17, с. 68]. Племяннное княжэнне дрыгавічоў, змяняецца феадальным княствам у выніку адміністрацыйнай рэформы вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. У Тураве князем быў пасаджаны прыёмны сын Уладзіміра Святаполк. Гэтым актам закончылася існаванне княжання дрыгавічоў і быў пакладзены пачатак існаванню Тураўскага княства [3, с. 170]. Але ў адрозненні ад Полацкага княства, у Тураўскім княстве не было замацавана асобнай княжацкай дынастыі, і ўзнікненне княжацкай улады на землях беларускага Палесся звязана з Кіеўскім вялікім князем, якому яна была падпарадкавана.

Паступова, на працягу IX – X стагоддзяў нарманская палітычная эліта цалкам асімілявалася ў славянскім асяроддзі. У далейшыя часы нарманскія дружыны выкарыстоўваліся ў якасці ваенных наймітаў, пра якіх згадвае Сага аб Эймундзе [28]. Аб «славянізацыі» княжацкай палітычнай эліты і адлучэнні варажскай дружыны ад князя сведчыць паведамленне летапісу пад 980 годам: «Онъ (Уладзімір Святаславіч – *Ю. К.*) же рече (варагам – *Ю. К.*): "Идите". Изъбра от нихъ мужа добры и смыслены и храбъры и раздая имъ грады; прочие же идоша Цесарюграду» [15, с. 46]. Гэта паведамленне гаворыць аб тым, што, пачынаючы з другой паловы X стагоддзя, князі выкарыстоўваюць варагаў у якасці наймітаў, дзеля дасягнення сваіх палітычных мэтаў. Адмова Уладзіміра варажскаму войску ў выплаце жалавання і адпраўка асноўнай іх часткі ў Канстанцінопаль, сведчыць аб зліцці княжацкай улады з мясцовым паспольствам і асіміляцыі іх у славянскім культурным і палітычным асяроддзі. Пачынаючы са Святаслава, князі ўжо носяць славянскія імёны.

З канца X – пачатку XI стагоддзя адбываецца далейшае развіццё ў эвалюцыі княжацкай улады на землях старажытнай Русі. Князі IX – X стагоддзяў атрымалі ўладу над грамадствам, а Уладзімір Святаславіч (980 – 1015 гг.) узняў функцыю ўлады на якасна новы узровень, вярнуўшы яе ў спрадвечна прызначаную ёй нішу забеспячэння інтарэсаў грамадства [20, с. 61]. Нашчадкі князя на полацкім і кіеўскім сталах працягнулі яго справу. Яны адмаўляюцца ад актыўнай знешняй палітыкі, якую практыкавалі іх продкі – нарманы. Эпоха вікінгаў (канец VIII – XI ст.) у краінах Усходняй і Заходняй Еўропы скончылася. Пачынаецца будаўніцтва моцнай унутранай улады. Скандынаўская палітычная эліта асядае на землях, асімелюецца з мясцовым насельніцтвам і пачынае займацца ўладкаваннем сваёй улады. Войны цяпер былі сродкамі дасягнення дакладных палітычных мэтаў, чым справай узбагачэння і праслаўлення асобнага князя і яго дружыны.

Такім чынам, улада атрымлівае шчыльнейшую тэрытарыяльную прывязку. Як пазначае Я.У. Новікаў: «Нарэшце, дзяржава, якая мела тры важнейшых элементы: уладу, закон і тэрыторыю з пэўнай інфраструктурай, мела патрэбу ў сіле, якая мусіла б гэтай тэрыторыяй пастаянна і эфектыўна кіраваць» [20, с. 63]. У выніку чаго адбываецца патрэба ў дзяржаўным апараце. Спачатку гэтая функцыя лягла на князя і яго варажскую дружыну. Ужо Уладзімір, пасля ўзяцця Кіева вылучыў лепшых мужэй і адаслаў іх кіраваць сваімі гарадамі. Развіцце дзяржаўнага кіравання і горадабудаўніцтва падоўжылі традыцыю прыцягнення да ўлады вайскова-дружыннага саслоўя. Аб адміністрацыйнай дзейнасці полацкага князя Усяслава Брачыславіча (1044 – 1101 гг.) гаворыцца ў «Слове пра паход Ігараў»: «Всеслав князь людем судяше, князем грады рядяше» [31, с. 90]. Адбываецца фарміраванне дзяржаўнага княжацкага апарату, які выходзіць з дружыннай арганізацыі. Далучэнне дзяржаўнага апарату да ўлады, тэрытарыяльнай арганізацыі і закону завяршыла фарміраванне асноўных, базавых элементаў, на якіх грунтавалася дзяржава [20, с. 63].

З прыняццем Руссю хрысціянства ў канцы X стагоддзя (988 г.), з ідэямі монацэнтрызму, былі замацаваны пазіцыі князя як «намесніка Бога на зямлі». Хрысціянізацыя Полацкай зямлі адкрыла магчымасць ва ўпарадкаванні княжацкай улады на далучаных землях балцкага рэгіену [10, с. 17 – 18]. Даволі мірнае распаўсюджанне хрысціянства на полацкай зямлі, у адрозненні ад тураўскай, дзе мелі месца крывавыя сутыкненні, абумоўлена роднаснымі сувязямі княжацкіх дынастый Кіева і Полацка. Пры адкрытай варожасці ў XI – XII стагоддзях двух родаў, Ізяславічаў і Яраславічаў, яны маюць адзінага продка – Уладзіміра Святаславіча. На момант хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх земляў у Полацку княжыў сын

Уладзіміра і ўнук Рагвалода Ізяслаў. На роднасных сувязях Уладзіміру лягчэй было праводзіць хрысціянізацыю крывічоў і балцкіх пляменаў Падзвіння праз сына, якога падтрымлівала мясцовае паспольства і ў якім быў увасоблены працяг мясцовай дынастычнай лініі.

Пасля прыняцця хрысціянства кіеўскі вялікі князь Уладзімір Святаславіч уводзіць новую сістэму кіравання Старажытнарускай дзяржавай. Уладзімір пасадзіў сваіх сыноў намеснікамі ў Ноўгарадзе, Тураве, Растове, Мураме, Драўлянскай зямлі, Уладзіміры, Тмутаракані [15]. Княжэнні займалі сыны вялікага князя ў парадку старэйшынства. Па значнасці другім пасля Кіева княжэннем было Наўгародскае. Яго займаў старэйшы з братоў. Калі старэйшы з братоў паміраў, яго месца займаў наступны па старэйшынству князь. Іншыя прасоўваліся па іерархічнай лесвіцы на адну прыступку вышэй [21, с. 45]. Рэформа Уладзіміра надала пэўную трываласць і цэнтралізаванасць сістэме дзяржаўнага кіравання і паклала канец існаванню племянных княжанняў [36, с. 505]. Але новая адміністрацыйная рэформа не выяўляла дастатковай згуртаванасці паміж рознымі землямі, якія ўваходзілі ў яе склад. Моцна адрозніваліся іх геаграфічнае становішча, этнічны склад і палітычныя памкненні [20, с. 11]. На полацкае намесніцтва быў пасаджаны сын Уладзіміра і Рагнеды, Ізяслаў, тураўскім намеснікам стаў Святаполк [15]. На думку В.І. Сергеевіча, падпарадкаванне сыноў бацьку ажыццяўлялася ў тым, што пры яго жыцці, сыны ніколі не былі самастойнымі ўладарамі ў сваіх землях: «Если им и была дана в управление самостоятельная волость, они управляли ею в качестве посадников князя – отца, а не самостоятельных владельцев» [30, с. 122]. Гэты прынцып падначаленага становішча датычыўся ўсіх сыноў Уладзіміра, акрамя полацкага князя Ізяслава, бо факт перадачы Ізяславу полацкага княства сведчыць не аб праяве цантралізатарскіх памкненняў кіеўскага князя, а аб аднаўленні дынастыі Рагвалодавічаў [3, с. 152]. Ужо сын Ізяслава, Брачыслаў (1003 – 1044 гг.), выступае як незалежны ўладар Полацкага княства.

Нягледзячы на падначалены стан сыноў вялікага князя, адбываліся сутычкі і сваркі вялікага князя з сынамі-намеснікамі. У 90-х гадах Х стагоддзя ён пазбавіў тураўскага княжэння Святаполка, а ў 1015 годзе наўгародскі князь Яраслаў адмовіўся плаціць даніну ў Кіеў, чым выклікаў намер Уладзіміра ісці на Ноўгарад вайной. Як пазначае А.Е. Праснякоў: «Если власть над теми или иными областями при жизни отца носила печать бунта против отцовской власти, то по его смерти князья могли опереться на обычноправовой факт семейных разделов унаследованной отчины или вызвать упорную борьбу – вне всяких обычноправовых норм – против распада отчины, за сохранения её единства в руках одного владельца» [22, с. 32]. Гісторыя рускіх земляў другой паловы XI стагоддзя насычана ўпартай барацьбой сыноў вялікага князя Яраслава Уладзіміравіча (1019 – 1054 гг.) за вялікакняжацкі стол. Княжацкія адносіны другой паловы X – XI стагоддзя адрознівалі адносіны паміж князямі аднаго роду – бацькамі і сынамі, з аднаго боку, і князямі-братамі – з другога. Шмат канфліктаў паміж князямі былі абумоўлены імкненнем таго ці іншага князя прывесці свае адносіны з братамі да формы «бацькоўскай» сям'і, з яе жорсткім падпарадкаваннем «сыноў» «бацьку» [24]. У гэтай сувязі палітычная гісторыя Полацкага княства адрозніваецца ад астатніх земляў Русі. Да 1104 года мы не маем сведчанняў аб княжацкіх міжусобных сварках. Факт адсутнасці ў гэты перыяд унутрыполацкіх княжацкіх супярэчак С.В. Тарасаў тлумачыць «паразуменнем і ўнутраным ладам паміж прадстаўнікамі княжацкай дынастыі» [33, с. 266]. Але сапраўдная адсутнасць спрэчак паміж полацкімі князямі тлумачыцца вельмі проста: іх не магло быць з прычыны пераемнасці ўлады па лініі Рагвалод – Ізяслаў – Брачыслаў – Усяслаў, бо ўсе пералічаныя з'яўляліся адзінкавымі дзецьмі ў сем'ях пасля Ізяслава.

Князь у Полацкай зямлі XI стагоддзя быў адзінаўладным гаспадаром. Але нягледзячы на гэта полацкія князі маглі ў поўнай меры прэтэндаваць на кіеўскі вялікакняжацкі стол, бо з'яўляліся прамымі нашчадкамі кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. На думку Ю.А. Зайца, у аснове канфлікту паміж Усяславам Брачыславічам і Яраславічамі ляжалі прэтэнзіі полацкага князя на вялікакняжацкі кіеўскі стол [11, с. 91 – 93]. Паводле звестак «Эймундавай сагі», бацька Усяслава, Брачыслаў Ізяслаўіч, быў суправіцелем Яраслава Уладзіміравіча ўсіх земляў Кіеўскай Русі і займаў кіеўскі княжацкі стол: «Яна (Інгігерд – жонка Яраслава – *Ю. К.*) адказала Конунгу Ярыцлейву (Яраславу – *Ю. К.*), што яму княжыць у самай галоўнай часцы Гардарыкі – Хольмградзе (Ноўгарадзе – *Ю. К.*), а Вартылаву (Брачыславу – *Ю. К.*) валодаць Кунігардам (Кіевам – *Ю. К.*), другой лепшай часткай усіх уладанняў – ад чаго ён будзе іх мець удвая болей» [28, с. 114]. Такім чынам, з'яўляючыся князем Полацкай зямлі і не маючы права прэтэндаваць на асобныя часткі Кіеўскай Русі, Усяслаў Брачыславіч валодаў правам на вярхоўную ўладу ў ёй. Прэтэнзія Усяслава на кіеўскі стол і авалоданне Кіевам адлюстравана ў «Слове пра паход Ігараў»:

«На седьмом веце Трояни
връже Всеславъ жребий
о дивицю себе любу.
Тъй клюками подпръ ся о кони
и скочи къ граду Кыеву
и дотчеся стружиемъ
злата стола киевьскаго» [31, с. 88].

Як пазначае І.А. Марзалюк у працы «Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI – XVII стст.»: Полацкія князі добра памяталі, што яны не толькі Рагвалодавічы, але і Рурыкавічы [18].

**Заключэнне.** Працэс усталявання дзяржаўнасці на беларускіх землях праходзіў ва ўмовах трансфармацыі грамадскага ладу і быў звязаны з узнікненнем і эвалюцыяй вярхоўнай княжацкай улады, галоўнай апорай якой была дружына.

У перыяд «ваеннай дэмакратыі» VI – VIII стагоддзяў вайна і ваенная моц адасобленай часткі племяннога грамадства на чале з князем стварылі альтэрнатыву панавання родавай арыстакратыі, якая з'ўлялась неад'емнай часткай абшчыны і кіравала з дапамогай свайго аўтарытэту, абапіраючыся на традыцыйны этнас [19, с. 55]. Вылучэнне княжацкай улады накіравала далейшае развіцце грамадства ў палітычнае рэчышча, паставіла ў яго цэнтр з'яву палітычнай і грамадскай улады і магутнасці.

З прыходам нарманаў-варагаў змяняецца характар княжацкай улады. Калі ў часы ваеннай дэмакратыі князь і дружына былі адасоблены ад астатняга грамадства сацыяльна, то цяпер яны адасоблены і ў этнічным плане.

Канец X – пачатак XI стагоддзя характарызуецца новым крокам у эвалюцыі княжацкай улады. За князем замацоўваецца статус вярхоўнага ўладара сваёй зямлі, гаранта абароны княства ад знешняй небяспекі і ахоўніка ўнутранага міру. Адбываецца канчатковая лігітымізацыя княжацкай улады ў мясцовым грамадстве. Разам з тым у XI стагоддзі на землях Кіеўскай дзяржавы ўзнікае праблема наследавання княжацкай спадчыны, якая яшчэ не закранула зямель Полацкага княства, але з пачатку XII стагоддзя гэтыя праблемы будуць датычыцца і Полаччыны.

Перыяд XI стагоддзя на беларускіх землях можна характарызаваць як час магутнасці Полацкай дзяржавы. Вярхоўная ўлада ў гэты перыяд належыць князю. Але характар палітычнага ўладарніцтва князя нельга назваць манархіяй – улада князя не была абсалютнай. Дзяржаўны лад беларускіх земляў XI стагоддзя можна назваць раннефеадальнай дуалістычнай манархіяй, бо ён адлюстроўвае палітычны дуалізм, увасоблены ў двух цэнтрах улады: князя і баярскай арыстакратыі [32, с. 18].

ЛІТАРАТУРА

1. Археалогія Беларусі: у 4 т. / Я.Г. Звяруга [і інш.]; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX – XIII стст.). – 554 с.: іл.
2. Беляев, И.Д. Рассказы из русской истории. История Полотска, или Северо-Западной Руси, от древнейших времен, до Люблинской унии / И.Д. Беляев. – М. – Ч. 1 [Строй жизни Полотска и ВКЛ]. – 456 с.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: «Экаперспектыва», 2000. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
4. Гісторыя Беларусі: падруч.: у 2 ч. / Я.К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск: Выш. шк., 2003. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 416 с.
5. Греков, Б.Д. Киевская Русь / Б.Д. Греков. – М.: АСТ МОСКВА, 2006. – 671 с.
6. Данилевский, И.Н. Древняя Русь глазами современников и потомков (IX – XII стст.) / И.Н. Данилевский. – М.: Аспект пресс, 1998. – 205 с.
7. Дернович, С. Норманнский этнический элемент в общественно-социальной структуре Полоцка в IX – XI вв. (к постановке проблемы) / С. Дернович // Беларускі горад у часе і прасторы: 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: зб. навук. прац. – Наваполацк: ПДУ, 2001. – 292 с.
8. Дьяконов, М.А. Очерки общественного и государственного строя древней Руси / М.А. Дьяконов. – СПб.: Изд-во «Право». – 342 с.
9. Долгов, В.В. Быт и нравы Древней Руси / В.В. Долгов. – М.: Яуза, Эксмо, 2007. – 512 с.
10. Дук, Д.У. Феномен станаўлення дзяржаўнасці на землях полацкіх крывічоў (IX – XI стст.) / Д.У. Дук // Спадчына. – 2003. – № 6. – С. 16 – 18.
11. Заяц, Ю.А. Полоцкий князь Всеслав и Ярославичи в 1065 – 1066 г.: от Пскова до Белгорода / Ю.А. Заяц // Гістарычна-археалагічны зборнік. – М., 1994. – № 4. – С. 91 – 93.
12. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі; уступ. арт. А.Н. Грыцкевіча; камент. і заўвагі Э.Н. Гнеўкі. – 5-е выд. – Мінск: Беларусь, 1992. – 190 с.
13. Казакявичюс, В.К. Оружие балтских племен II – VII вв. на территории Литвы / В.К. Казакявичюс. – Вильнюс, 1988. – 241 с.
14. Катлярчук, А. Час вікінгаў у Беларусі: канец IX – пачатак XIII ст. / А. Катлярчук [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.jivebelarus.net/history/gistografia/vikings-time-at-belarus.htm. – Дата доступу: 11.05.2008.
15. Лаврентьевская летопись / под ред. Е.Ф. Карского. – [Респ. изд. 1926 – 1928 гг.]. – М.: Языки рус. культуры: Кошелев, 1997. – М, VIII, 733 с. – [Полное собрание русских летописей].
16. Любавский, М.К. Лекции по древней русской истории до конца XVI века / М.К. Любавский. – 3-е изд. – М.: М. и С. Сабашниковы, 1918. – 306 с.

17. Лысенко, П.Ф. Туровская земля IX – XIII вв. / П.Ф. Лысенко. – Минск, 1990. – 311 с.
18. Марзалюк, І.А. Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў 11 – 17 стст. / І.А. Марзалюк [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lingvo.minsk.by/mab/Glook/BVOKS/Albaruthenica.htm. – Дата доступу: 13.09.2007.
19. Новікаў, Я.У. Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.) / Я.У. Новікаў. – Мінск: Логвінаў, 2007. – Т. 1. – 208 с.
20. Новікаў, Я.У. Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.) / Я.У. Новікаў. – Мінск: Логвінаў, 2008. – Т. 2. – 300 с.
21. Павленко, Н.И. История России с древнейших времен до 1861 года: учеб. пособие для вузов / Н.И. Павленко, И.Л. Андреев, В.А. Федоров; под ред. Н.И. Павленко. – 3-е изд., перераб. – М.: Высш. шк., 2004. – 536 с.: ил., карт.
22. Пресняков, А.Е. Княжое право в Древней Руси / А.Е. Пресняков; текст ст. и примеч. М.Б. Свердлова. – М.: Наука, 1993. – 634 с.
23. Плотникова, О.А. Генезис и лигитимизация института княжеской власти в древнерусском обществе VI – XII вв. / О.А. Плотникова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://dibase.ru/article/ /23032009_plotnikovaoa/5. – Дата доступу: 23.03.2009.
24. Плотникова, О.А. Кристаллизация института княжеской власти как социально-политического компонента древнерусской цивилизации / О.А. Плотникова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zpu–jornal.ru/e–zpu/2008/6/Plotnikova_crystallization. – Дата доступа: 06.01.2008.
25. Преображенский, А.Г. Этимологический словарь русского языка / А.Г. Преображенский. – М., 1959. – 843 с.
26. Пьянков, А.П. Происхождение общественного и государственного Строя Древней Руси / А.П. Пьянков. – Минск: Изд-во БГУ, 1980. – 208 с.
27. Рябцевич, В.Н. О чем рассказывают монеты / В.Н. Рябцевич; под ред. д-ра ист. наук А.Н. Игнатенко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Народная асвета, 1977. – 399 с.
28. Сага об Эймунде Хрингссоне // Исландские королевские саги о Восточной Европе (первая треть XI в.) / Т.Н. Джаксон. – М.: Наука, 1994. – 245 с.
29. Соловьев, С.М. Об истории древней России / С.М. Соловьев. – М.: Просвещение, 1993. – 545 с.
30. Сергеевич, В.И. Лекции и исследования по древней истории русского права / В.И. Сергеевич. – 2-е изд., доп. – СПб.: Тип. М.М. Стасюкевича, 1899. – VI, 480 с.
31. Слово о полку Игореве / вступит. ст., ред. текста, досл. и объяснит., пер. с древнерус., примеч. Д.С. Лихачева; грав. В.А. Фаворского и М.И. Пикова. – 8-е изд. – М.: Дет. лит., 1979. – 221 с., ил.
32. Сокал, С.Ф. Гісторыя дзяржавы і права БССР (дакастрычніцкі перыяд) / С.Ф. Сокал. – Минск, 1989. – 56 с.
33. Тарасаў, С.В. «Белыя плямы» полацкай археалогіі і гісторыі / С.В. Тарасаў // Зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20 – 21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – 300 с.
34. Владимирский-Буданов, М.Ф. Обзор истории русского права / М.Ф. Владимирский-Буданов. – М.: Территория Будущего, 2007. – 800 с.
35. Фроянов, И.Я. Исторические реалии в летописном сказании о призвании варягов / И.Я. Фроянов // Вопросы истории. – М., 1991. – № 6. – С. 7 – 10.
36. Фроянов, И.Я. Начала русской истории / И.Я. Фроянов. – М.: Изд. дом «Парад», 2001. – 975 с.

*Паступіў 24.03.2010*

## GENESIS OF THE OF KNYAZ POWER IN BELARUS LANDS IN 8 – 11th CENTURIES

***J. KEZHA***

*The research characterizes evolution and development of institute of knyaz power in Belarus lands from the period of "military democracy" (6 – 8 centuries) to the establishment of independent Polotsk principality in the 11 century. The analysis is carried out on the bases of examination of written sources (chronicles, literary works) and historiography. A comparative analysis of the origin and development of knyaz power of Turov and Polotsk lands-principalities in the context of state-establishing processes in other lands of Belarus and Eastern Europe. It is stated that with Norman-Varangian arrival the character of the knyaz power changes (social segregation correlates with the ethnical one). The period of the 11 century in Belarusian lands can be characterized as the time of the Polotsk state growth. The Supreme power during this period belongs to the knyaz. But the character of the political power of the knyaz can't be estimated as a monarchy because the power of the knyaz wasn't absolute.*